

# МУЗЕЯЗНАЎСТВА

*А.І.СМОЛІК*

## ТЫШКЕВІЦКІЯ ЧЫТАННІ

У шэрагу вышэйшых навучальных і навукова-даследчых устаноў склаліся цікавыя формы падвядзення вынікаў даследавання творчасці беларускіх пісьменнікаў і паэтаў, дзеячаў навукі і культуры. Так, штогод Літаратурна-мемарыяльны музей Я.Коласа сумесна з Інстытутам літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі праводзяць “Каласавіны”. БДПУ імя М.Танка правялі 6 Танкаўскіх чытанняў, у Віцебскім дзяржаўным універсітэце ладзяцца Машэраўскія чытанні. На наш погляд, такая форма арганізацыі навуковай дзейнасці спрыяе стварэнню ўстойлівых сувязей паміж даследчыкамі, якія займаюцца вывучэннем пэўных праблем развіцця айчыннай навукі, мастацтва і культуры, аб’яднанню намаганняў па вырашэнні актуальных праблем сацыядынамікі культуры.

Увосень 2008 г. у БДУ культуры і мастацтваў адбыліся Першыя Тышкевіцкія чытанні. Ініцыятарам іх правядзення выступілі навукоўцы кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства. Гэта і зразумела, бо Яўстафій і Канстанцін Тышкевічы разам з бацькам Піем Феліцыянавічам у XIX ст. зрабілі каштоўны ўклад у развіццё беларускай фалькларыстыкі і краязнаўства. Але, бадай, самая галоўная іх заслуга ў тым, што яны з’яўляюцца заснавальнікамі навуковай археалогіі і музеялогіі. Менавіта аб гэтым распавядалі выкладчыкі універсітэта і супрацоўнікі Лагойскага краязнаўчага музея, стваральнікамі якога ў свой час былі графы Тышкевічы.

Доктар гістарычных навук, прафесар *А.П.Грыцкевіч* даследаваў генеалогію старажытнага роду Тышкевічаў і падчас чытанняў азнаёміў студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэта з радаводам Тышкевічаў. Пачатак графскага роду сягае ў XV ст. У наступным стагоддзі род падзяліўся на дзве галіны: Скумінаў-Тышкевічаў і Тышкевічаў-Каляніцкіх. У гэты ж час Тышкевічы набылі Лагойск. Васіль Тышкевіч у 1569 г. атрымаў ад караля польскага і вялікага князя ВКЛ тытул графа “на Лагойску і Бярдзічаве”. Графскі тытул быў зацверджаны ў XIX ст. у Расіі, Саксоніі і Аўстрыі. На Скумінаў-Тышкевічаў графскі тытул пашыраны не быў. Яшчэ ў XVI ст. Лагойск стаў рэзідэнцыяй Тышкевічаў на Беларусі. Прадстаўнікі гэтага магнацкага роду займалі дзяржаўна-адміністрацыйныя і вайсковыя пасады ў Вялікім княстве Літоўскім у XVI–XVIII стст. Былі ўладальнікамі вялікіх маёнткаў на тэрыторыі Беларусі, на Украіне і ў Літве.

Кандыдат гістарычных навук, дацэнт *А.А.Трусаў* прасачыў навуковую археалагічную дзейнасць братоў Тышкевічаў. Навуковец падкрэсліў, што пачынаючы з 1837 г. яны кожнае лета даследавалі курганы на тэрыторыі Мінскай губерні. Аналізуючы пахавальны абрад славян і іх суседзяў, Яўстафій і Канстанцін Тышкевічы прыйшлі да высновы пра іх блізкасць. Гэтыя высновы, падмацаваныя пазнейшымі археалагічнымі даследаваннямі, і сёння з’яўляюцца пануючай думкай пра адзінства паходжання славянскай і балцкай культур на Беларусі. Дакладчык адзначыў таксама, што Яўстафій Тышкевіч зрабіў дэталёвае апісанне каменных прылад працы і ў дадатку да кнігі “Археалагічныя даследаванні” змясціў іх малюнкі. У 1842 г. выдаў кнігу “Погляд на крыніцы мясцовай археалогіі, або Апісанне некаторых помнікаў старажытнасцей у Заходніх губернях Рускай дзяржавы”. У выніку даследаванняў сотняў крывіцкіх курганоў ён першы ўказаў на іх этнічную асаблівасць – скроневыя кольцы ў жанчын, тым самым даў ключ для вызначэння тэрыторыі рассялення крывічоў. Аналіз пахавальнага інвентару дазволіў зрабіць вывады і пра гандлёвыя сувязі крывічоў. Мясцовыя прылады працы і вырабы былі на ўзроўні тагачасных вырабаў суседніх краін. А з гэтага вынікала, што ў часы так званай ваеннай дэмакратыі тут не было таго варварства, пра якое сцвярджалі некаторыя гісторыкі. Багаты

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і бедны інвентар курганных пахаванняў дазваляў зрабіць вывад пра сацыяльную няроўнасць тагачаснага грамадства.

Яўстафій Тышкевіч упершыню пры археалагічных раскопках карыстаўся навуковымі метадамі скандынаўскіх археолагаў. У прыватнасці, абапіраўся на метад падзелу старажытнасцей на тры эпохі-вякі (каменны, бронзавы, жалезны) вядомага дацкага археолага К.Томсена. Дарэчы, гэты метад ён узяў на ўзбраенне і пры сістэматызацыі старажытнасцей у музеі ў Лагойску (з 1842 г.), а пазней і ў Віленскім музеі старажытнасцей.

Кандыдат гістарычных навук, ст. выкладчык *А.Я.Паўлава* спыніла ўвагу ўдзельнікаў чытанняў на праблеме вывучэння архіва графскага роду. Складанасць даследавання дакументаў роду Тышкевічаў, на яе погляд, заключаецца ў тым, што на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь дакументаў роду Тышкевічаў як адзінага комплексу архіўных дакументаў не захавалася. Галоўны збор матэрыялаў прадстаўлены ў Дзяржаўным гістарычным архіве Літвы, бібліятэцы Акадэміі навук Літвы і аддзеле рукапісаў бібліятэкі Віленскага універсітэта. Пэўная частка дакументаў захоўваецца ў Нацыянальнай бібліятэцы ў Варшаве, а таксама ў Вроцлаўскім Асалінэўме і бібліятэцы АН Украіны ў Львове. Даследчыца прыйшла да высновы, што будучая праца айчынных даследчыкаў дазволіць высветліць шмат новых фактаў аб адным са знакамітых родаў Беларусі.

Кандыдат гістарычных навук, дацэнт *А.М.Нароўская* свой даклад прысвяціла аналізу унікальнай калекцыі прадметаў мастацтва, сабранай Тышкевічамі, якая была вядома далёка за межамі Беларусі. Навуковец адзначыла, што пачатак мастацкай калекцыі быў пакладзены маці – графіняй Аўгустай Тышкевіч. Менавіта яна і далучыла Яўстафія і Канстанціна да збору мастацкіх рарытэтаў.

У калекцыі былі аўтапартрэты Яна Рустэма і Яна Дамеля, бюсты тагачасных дзеячаў культуры Беларусі і Літвы. Былі тут, у прыватнасці, работы скульптара Рафала Слізеня. У 1850 г. Слізень выканаў бронзавы медальён з партрэтам Яўстафія Тышкевіча.

У Лагойск прыязджаў у госці Напалеон Орда, музыкант, мастак. Ён зрабіў замалёўку палаца Тышкевічаў.

Экспанаваліся тут таксама творы майстроў Рыма, Фларэнцыі, Неапаля, старажытныя этрускія вазы, мастацкія вырабы з Егіпта.

Паведамленне кандыдата гістарычных навук, дацэнта *І.Н.Колабавай* было звязана з "Каталогам музея древностей, 1885 г." Як ужо адзначалася, браты Тышкевічы заснавалі ў 1855 г. Віленскі музей старажытнасцей. Тады ж быў складзены каталог музейных экспанатаў, у які было ўключана звыш 10 тыс. адзінак.

У названым каталогу давалася кароткая даведка па гісторыі стварэння і дзейнасці музея і прыводзілася падрабязнае апісанне экспазіцыі, падзеленай на асобныя часткі, абазначаныя літарамі.

У аддзеле А экспанаваліся каменныя прылады працы, у аддзеле Б – бронзавыя вырабы, у аддзеле Г – жалезныя прадметы (пікі, нажы, замкі, ключы).

Этнаграфічныя матэрыялы, прывезеныя з Кітая, Японіі, Егіпта і іншых краін свету, размяшчаліся ў аддзеле Д, "міфалагічныя" прадметы – у аддзеле Е. Былі аддзелы Ж, З, І, К.

У аддзеле Л дэманстраваліся "рэдкія" рэчы: медальён і локан Кацярыны II, тры гусіныя пяры, якімі Аляксандр II падпісваўся ў кнізе ганаровых наведвальнікаў Віленскага музея ў 1858, 1860, 1867 гг., кавалак трансатлантычнага кабелю, медны гузік з "выявай негра ў цапах", адзенне эскімосаў з "рыбьего пузыря", шоўкавая хустка з планам Кіева-Пячорскай лаўры. У аддзеле М былі прадстаўлены жывапіс і скульптура.

Такім чынам, гэты каталог дае не толькі агульнае ўяўленне аб экспазіцыі Віленскага музея старажытнасцей у канцы XIX ст., але сведчыць таксама аб выкарыстанні Тышкевічамі сапраўдных навуковых музеелагічных метадаў пры стварэнні экспазіцый і класіфікацыі экспанатаў музея.

Дырэктар Лагойскага гісторыка-краязнаўчага музея імя К. і Я. Тышкевічаў *С.І.Жыгунова* падзялілася ўражаннямі аб міжнароднай экспедыцыі, прысвечанай падарожжу К.Тышкевіча па рацэ Віліі. Як вядома, граф Канстанцін у 1857 г. на свае сродкі ажыццявіў падарожжа па рацэ Віліі ад яе вытокаў да ўпадзення ў Нёман.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Падарожжа доўжылася чатыры месяцы. За гэты час К.Тышкевіч пабываў у 295 вёсках і мястэчках. Вынікам яго падарожжа стала кніга “Вілія і яе берагі”.

Падчас экспедыцыі К.Тышкевіч праводзіў раскопкі, апісаў найбольш цікавыя археалагічныя помнікі. Значнае месца ў кнізе К.Тышкевіча займаюць помнікі архітэктуры (замкі, касцёлы, цэрквы і інш.). Зробленае аўтарам іх грунтоўнае апісанне ў цэлым шэрагу выпадкаў суправаджаецца выкананымі з натуры графічнымі малюнкамі ўдзельнікам падарожжа Артурам Бартэльсам. Гэта робіць манаграфію яшчэ больш каштоўнай для сучасных даследчыкаў.

1 чэрвеня 2007 г. вілейскія і лагойскія краязнаўцы-энтузіясты на лодках рушылі ў падарожжа шляхам К.Тышкевіча. Экспедыцыя доўжылася 34 дні, але за гэты час навукоўцы наведалі ўсе мясціны, археалагічныя і архітэктурныя помнікі, па якіх некалі ішоў граф Тышкевіч. На кожным прывале ўсе чыталі кнігу “Вілія і яе берагі” і параўноўвалі, як змяніліся гістарычныя аб’екты з тых далёкіх часоў, што захавалася, а чаго ўжо няма ўвогуле. У працэсе падарожжа да асноўнага саставу яго ўдзельнікаў далучаліся турысты-аматары з Мінска, Смаргоні і іншых гарадоў Беларусі.

У Літве да беларускіх краязнаўцаў далучыліся аматары з Літвы. Падарожжа завяршылася ў Каўнасе, дзе Вілія ўпадае ў Нёман. Удзельнікі экспедыцыі, якія прайшлі ўвесь маршрут, былі ўзнагароджаны памятнымі медалямі, што падрыхтавалі нашы літоўскія суседзі.

Вынікі экспедыцыі падводзіліся на канферэнцыях у Беларусі і Літве, у Вільнюсе выйшла факсімільнае выданне манаграфіі К. Тышкевіча “Вілія і яе берагі”, быў зняты поўнаметражны фільм, прысвечаны экспедыцыі.

Галоўны захавальнік фондаў Лагойскага гісторыка-краязнаўчага музея *Д.В.Рамандзіна* пазнаёміла ўдзельнікаў чытанняў з гісторыяй горада Лагойска, якая пачынаецца з 1078 г. Асаблівую ўвагу яна звярнула на развіццё горада ў часы валодання ім графамі Тышкевічамі. Яны пабудавалі ў Лагойску ў XVI–XVIII стст. замак, касцёл, кляштар базылян, уніяцкую Юраўскую царкву. Тут ў XIX ст. дзейнічала фабрыка ільняных і баваўняных тканін, заснаваная Канстанцінам Тышкевічам. Акрамя таго, у Лагойску працаваў чыгунны завод, на якім са старога лому выраблялiся сельскагаспадарчыя прылады, дзейнічаў невялікі шкіпінарны і медны заводы. Існаваў крэдытны банк для мяшчан і сялян.

Напярэдадні чытанняў ва універсітэце была ўрачыста адчынена мемарыяльная аўдыторыя ў гонар К. і Я. Тышкевічаў, з экспанатамі якой азнаёміліся ўдзельнікі імпрэзы. Навукоўцы і супрацоўнікі Лагойскага музея выказаліся за перыядычнае наладжванне такіх чытанняў з пашырэннем кола іх удзельнікаў. Увосень 2009 г. у Лагойску адбудуцца II Тышкевіцкія чытанні, у якіх прымуць удзел дактары гістарычных навук А.П.Грыцкевіч, Г.В.Штыхаў, доктар культуралогіі А.І.Смолік, дацэнты І.Н.Колабава, А.М.Нароўская, А.А.Трусаў, старэйшыя выкладчыкі І.І.Бамбешка, А.Я.Паўлава, аспіранты П.А.Каралёў, В.І.Вярбіцкая, краязнаўцы Вілейкі, Лагойска, Маладзечна.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ